# НОВЫ «БАРЫС ГАДУНОЎ»

**рэм'ера "Барыса Гадунова" М. Мусаргскага ў Нацыянальным адэмічным вялікім тэатры оперы ала падзеяй у культурным жыцці аліцы.**

Увага да оперы зусім не выпадко-:я. "Барыс Гадуноў" — рэфарма-рскі твор. Усё новае, што ўнёс імпазітар, стала ў значнай ступені ізначальным для далейшага развіц-і музычнага мастацтва. Актуаль-эсць жанру народнай драмы ў іеры ўскалыхнула многія розумы го часу, не знікла яна і зараз. Маг-ма, у канцы XX стагоддзя падоб-ія довады і з'явіліся зыходным пун-ам у рашэнні мастацкага савета тэ-ра на карысць пастаноўкі гэтага ора.

Яшчэ ў 1998 годзе адбылося кан-эртнае выкананне "Барыса Гадуно-", і, нарэшце, тэатр падрыхтаваў ізнічнае ўвасабленне спектакля. ля пастаноўкі оперы запрасілі Міка-ая Пінігіна, вядомага беларускага эжысёра, які ўжо зарэкамендаваў бе як мастак з нестандартным ты-эм мыслення і нетрадыцыйным па-ыходам да сталых норм. Гэта яго эугі вопыт супрацоўніцтва з іерным тэатрам, першым была эбота над "Візітам дамы" С. Картэ-з. За дэкарацыі гэтага спектакля ад-зэвае мастак-пастаноўшчык Зіновій 'арголін, запрошаны разам з М. Пі-гіным. Безумоўна, падобны тандэм эатральных дзеячаў і музычнага ка-эктыву даволі незвычайны і, вядо-а, унёс свежыя думкі ў афармлен-э пастаноўкі і выбар канкрэтных родкаў яго ўвасаблення.

Праца Сяргея Картэса, мастацка-з кіраўніка тэатра оперы, Аляк-эндра Анісімава, музычнага кіраўні-з, Вячаслава Чарнухі, дырыжора Барыса Гадунова", і Мікалая Пінігіна ыла вельмі няпростай. Як і ў любым эорчым калектыве, часам узнікалі эзнагалоссі па тым або іншым пы-танні, з'яўляліся новыя ідэі. А ўсё гэта павінна злучыцца ў адно непарыўнае цэлае — паўнацэнны оперны спек-такль.

Падрыхтоўчы перыяд пастаноўкі "Барыса" быў складаным і напружа-ным.

І вось наступіў дзень прэм'еры.

Усё ўбачанае і пачутае ў гэты ве-чар не было прынята публікаю адназ-начна. Першае, што ўразіла глядац-кую аўдыторыю, — дэкарацыі. Зас-лугоўвае асобай увагі і светлавое афармленне спектакля. Лазерныя промні, нязвыклыя для оперы, з'яў-ляліся ў ключавыя моманты сцэніч-нага дзеяння, відаць, падкрэсліваю-чы іх значнасць. Аднак не візуальныя эфекты вызначальныя ў ацэнцы пас-таноўкі оперы. Перапляценне і суіс-наванне псіхалагізму, містыкі, рэлі-гіі — вось на што трэба звяртаць ува-гу ў "Барысе". Як гэта ўвасоблена салістамі, спевакамі хору, музыкан-тамі аркестра? Што зрабіў для гэта-га рэжысёр? Пакуль цяжка даць вы-чарпальныя адказы. Пройдзе час, улягуцца эмоцыі, вось тады можна будзе атрымаць аб'ектыўную ад-знаку таго, што адбывалася на сцэ-не.

Многае ў спектаклі залежала ад трактоўкі галоўнага вобраза. Без сумнення, Алег Мельнікаў цара сыграў проста цудоўна. Ён паўставаў то магутным уладаром, то любячым бацькам, то грэшнікам, якога му-чыць чаканне Страшнага суда. Вы-датны акцёрскі дар спевака дазволіў яму дасканала перадаць усе адценні настрояў і лінію развіцця вобраза ад душэўнага неспакою праз вар'яцтва да смерці.



Дзякуючы яркаму выкананню, за-помніліся ролі Ксеніі (Е. Раеўская) і Фёдара (Г. Ляшук), дзяцей Барыса. Каларытнымі атрымаліся манах Варлаам (В. Кавальчук) і Міцюха, ча-лавек з народа (М. Качаноўскі). Многія харавыя сцэны ўражвалі рэа-лістычнасцю, а хор сялян і жабракоў "Хлеба, хлеба!" проста ўзрушыў слухачоў.

Канешне, кожны, хто прыйшоў у оперны тэатр, успрыняў "Барыса Га-дунова" па-свойму. Што ж, інакш і быць не магло.

Наталля **КАРДАШ.**
Фота БелТА.